### Літаратурная размінка

Паразважайце, чаму нельга забываць пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Чаму беларусы з пашанай ставяцца да ветэранаў вайны?

## ВАСІЛЬ ЗУЁНАК



Інтарэсы Васіля Зуёнка як даследчыка роднай літаратуры, як крытыка, як перакладчыка, як публіцыста і найперш як паэта шматгранныя, рознабаковыя. Працягваючы лепшыя традыцыі нашых класікаў, піша паэт непаўторна і плённа для дзяцей. Іскрыстыя жарты і казкі, загадкі і незвычайныя прыгоды — усё пад сілу дзіцячай музе Васіля Зуёнка (*Рыгор Барадулін*).

* * *

Прыйдзі аднойчы ў вечаровы час,
Калі плывуць дымы, як верасы,
Да кургана пясчанага, што нас
Разлучыць назаўжды, —
Прыйдзі, мой сын.

Павер хвіліну нейкую, што я
Жывы стаю між трапяткіх бяроз
І слухаю: у праведных баях
Што ты здабыў?
Што ў сэрцы ты прынёс?..



Правообладатель Национальный институт образования

Прыйдзі — як ветру жніўнага павеў,
Каб нада мною дыхалі палі
І колас той звінеў — не адзвінеў,
Што к сонцу на руках ты ўзняў спяліць.

Прыйдзі — як песня, што табе збярог
Бацькоўскі край і дбайна перадаў.
Прыйдзі — як рэха з тысячы дарог,
Дзе голас мой твае сцягі гайдаў.

Прыйдзі — як думкі вогненнай усплёск,
Як гром ракет, што ўзлёт твой акрыляў.
Прыйдзі, мая надзея і мой лёс, —
І лёгкай будзе для мяне зямля.

1. Чаму бацька лічыць сына сваёй надзеяй, сваім лёсам? Паразважайце, што значыць для бацькі сынава памяць пра яго.
2. Якім чалавекам хоча бачыць бацька сына? З якой просьбай звяртаецца да яго?
3. Якія мастацкія вобразы, створаныя пры дапамозе параўнанняў, сведчаць пра бацькаву мару? Раскрыйце іх сэнс.
4. Якую ролю адыгрывае ў вершы шматразовы паўтор слова *прыйдзі*?
5. Якую назву далі б вы гэтаму вершу? Абгрунтуйце сваю прапанову.
6. Звярніце ўвагу на рэпрадукцыю карціны Эдуарда Рымаровіча «Памяць». Паразважайце, у чым назіраецца сувязь паміж абодвума творамі мастацтва — вершам Васіля Зуёнка «Прыйдзі аднойчы...» і мастацкім палатном. Ці можа быць што агульнае ў лёсе герояў верша і карціны?
7. Падрыхтуйце вусны зварот да блізкага вам чалавека, каб расказаць яму пра асабістыя пачуцці, выказаць свае адносіны.



Правообладатель Национальный институт образования